УДК 821

# АСЭНСАВАННЕ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ Ў ТВОРАХ ВАСІЛЯ БЫКАВА

***канд. філал. навук, дац. З.І. ТРАЦЦЯК***
**Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт**

*Вылучаюцца асноўныя творы В. Быкава, у аповедаваю канву якіх уплецены падзеі Першай сусветнай вайны. Паводле пісьменніка, мінулае не страціла актуальнасці ў час новай навалы (1941–1945 гг.). Невыпадкова, што быкаўскія персанажы спрабавалі асэнсаваць вопыт бацькоў, які дазваляў лепей усвядоміць сутнасць Вялікай Айчыннай. Беларускі празаік падкрэсліваў, што ў першай палове XX ст. вайна – значны чыннік чалавечага існавання. Бясконцая чарада ўзброеных канфліктаў знайшла адлюстраванне ў выглядзе матыву вайны-кантынуума, які характаразываў не толькі творчасць В. Быкава але і замежных класікаў (напрыклад, Э. Хемінгуэя).*

Беларуская ваенная проза XX ст. прайшла складаны і драматычны шлях развіцця. Яго дынаміка абумоўлена шэрагам гістарычных, грамадска-палітычных і мастацкіх фактараў. Пісьменнікам прыходзілася ўлічваць разнастайныя аспекты. Напрыклад, у 1920–30-я гг. Першая сусветная *павінна была* абавязкова згадвацца ў кантэксце пазнейшых падзей: рэвалюцыі 1917 г., грамадзянскай вайны. У наступныя дзесяцігоддзі генетычная памяць айчынных баталістаў адвольна «карэктавалася» ў адпаведнасці з пануючай ідэалогіяй. Размова ішла нават не пра даўнюю беларускую літаратуру, звязанаю з гісторыяй продкаў-ваяроў, якія актыўна супрацьстаялі захопнікам, нярэдка – блізкім суседзям: у XX ст. яны сталі суграмадзянамі, такімі ж будаўнікамі інтэрнацыянальнага грамадства. Напрыканцы 1930-х – у 1940-я гг. айчыннае прыгожае пісьменства «страціла» шэраг значных напрацовак. Гвалтоўны палітызаваны перагляд беларускай прозы меў выключна негатыўныя вынікі. Напрыклад, у 1970-я гг. літаратары, што прысвячалі творы Вялікай Айчыннай, не ведалі пра знакавыя апавяданні М. Гарэцкага «Рускі», «Генерал» і кнігу «На імперыялістычнай вайне». Але, паводле А. Адамовіча, «народжанае ў літаратуры аднойчы знікнуць не можа. Зусім незалежна ад ранейшага, зноў яно паяўляецца – хай і ў другой форме, з другім значэннем» [1, с. 19].

Спадчына В. Быкава пра падзеі 1941–1945 гг. і генетычна, і тыпалагічна звязана з беларускай класікай мінулых эпох. Паказальна, што пісьменнік па-мастацку асэнсаваў не толькі быццё чалавека на фронце і ў тыле пад час Вялікай Айчыннай, але і звярнуўся да іншых узброеных канфліктаў першай паловы XX ст. Такі падыход дазваляў адлюстраваць быццё персанажаў і асобныя грамадска-палітычныя працэсы у шырокай плыні гісторыі. Больш-менш паслядоўна празаік апавядаў пра 1914–1918 гг., згадваў пра братазабойства 1917–1923 гг. Цікавасць да таго часу, верагодна, нарадзілася ў В. Быкава ў дзяцінстве. Бацька празаіка, Уладзімір Фёдаравіч, «быў змабілізаваны ў самсонаўскую армію, недзе ў Аўгустоўскіх лясах трапіў у палон і апынуўся ў Нямеччыне. Працаваў у баўэра … Яшчэ [ён] быў на грамадзянскай вайне, наступаў на Варшаву» [2, с. 10].

Заўважым, што асобныя аповеды У.Ф. Быкава па-мастацку апрацаваны ў аповесці «Аблава». Галоўны герой твора – Хведар Роўба – таксама трапіў у палон да немцаў. Спачатку ён «гібеў на варанай бручцы, калі … рабіў на чыгуначналіцейным заводзе. Затым трапіў да баўэра … кармілі па-людску, хоць рабіць прымушалі штодня без выхадных і святаў» [3, с. 422]. Увага непрытульнага персанажа-ўцекача да харчавання невыпадковая: усё жыццё ён пакутаваў ад недахопу ежы, што (у сукупнасці з іншымі паразамі) прыніжала яго годнасць. Разважанні празаіка выклікаюць адчуванне повязі не толькі з гісторыяй свайго роду, але і з папярэдняй літаратурнай традыцыяй. Яшчэ М. Гарэцкі у рамане «Віленскія камунары» параўнаў вайну з вымушаным постам, калі «голад усушаў усякую думку, рабіў вялым усякі чын. Хацелася многа спаць і ўва сне бачыць салодкія рэчы, есці смачныя стравы …» [4, с. 240]. У такім выпадку персанаж на доўгі час практычна страчваў звыклае чалавечае аблічча, бо быў вымушаны засяродзіцца на патрэба целах.

Ліхалецце не абмінула і іншых родзічаў В. Быкава. У час савецка-польскага супрацьстаяння, у ваколіцах роднай вёскі мастака слова адбыўся бой. Месца кровапраліцця атрымала назву «Бітая пожня», з ёй звязаны шэраг аповедаў, захаваных у народных успамінах. Маці пісьменніка, напрыклад, казала, што некаторыя сяляне знімалі там з забітых абутак і вопратку. Пра гэта яна «распавядала з асуджэньнем, амаль спалохам (гэта ж – вялікі грэх!) і паказвала ў вуглу хаты дзірку, дзе засела куля, што прыляцела адтуль, зь Бітай пожні … » [2, с. 10]. Такім чынам асноўныя ўзброеныя канфлікты пачатку стагоддзя ў дзіцячай свядомасці асацыяваліся з нечым надзвычай актуальным і блізкім: з гісторыяй уласнай сям’і, знаёмых, аднавяскоўцаў. Акрамя таго ў маладой асобы нараджалася ідэя пра так званую «вайну-кантынуум», якая распачалася ўжо шмат часу таму і была натуральным чыннікам чалавечага існавання на пачатку стагоддзя.

Дзіцячыя і юнацкія здагадкі пра сутнасць вайны пазней дапоўніліся ўласным франтавам вопытам. Паводле А. Шагалава, у кнігах В. Быкава «падтэкст, гульня фантазіі … сплаўлены ў адно з уласнымі назіраннямі за рэчаіснасцю» [5, с. 19]. Па аповесцях беларускага пісьменніка раскіданы згадкі пра асноўныя катаклізмы той эпохі: падзеі руска-японскай, Першай сусветнай («мікалаеўскай», «нямецкай»), грамадзянскай, савецка-польскай і савецка-філяндскай войн. Асобнае месца ў яго творчасці бясспрэчна займала Вялікая Айчынная. У аповесці «Трэцяя ракета» празаік ахарактарызаваў перыяд з 1905 па 1945 гг. так: «кожны год дзе-небудзь на свеце ішла вайна, дзяржавы, што не ваявалі, з усяе сілы рыхтаваліся да таго, … кавалася зброя, фарміравалася ўсялюдская злосць, рыхтавалася навуковае абгрунтаванне будучай бойні і раслі салдаты будучых рот, батальёнаў, палкоў …» [6, с. 348]. Варта ўвагі, што матыў «вайны-кантынуума» прасочваўся ў творчасці аднаго з улюбёных пісьменнікаў беларускага класіка – Э. Хемінгуэя (самы яскравы прыклад – зборнік апавяданняў «У наш час»).

Ужо працуючы над апавяданням «У ліхую часіну» (1959), В. Быкаў змог лаканічна, але надзвычай ёміста ахарактарызаваць Першую сусветную як бясконцыя «акопы, атакі, шрапнель, кроў, гразь і вошы. Лясныя беларускія прасторы – Аўгустоў, Сувалкі, Ваўкавыск, гора бежанцаў, руіны гарадоў і жах германскай навалы» [7, с. 273]. Ларывон – галоўны персанаж твора – таксама сутыкнуўся з вайной-кантынуумам. Едучы дадому са станцыі, куды ён адвёз сярэдняга сына, што збіраўся на вайну, стары прыгадаў, як «гадоў 25 назад гэтай самай дарогай на станцыю, на тую ж самую справу, што і сын, ішоў і ён, малады унтэр запасу» [7, с. 273]. Лёс злітасціўся над героем, падараваўшы жыццё і ганаровы статус Георгіеўскага кавалера, але і ён зведаў пакуты і здзек у палоне. Горш за перажытае было тое, што «вось зноў паўтарылася старое» [7, с. 273], і новае пакаленне патрапіла ў тую ж віхуру.

В. Быкаў не абмінуў сваёй увагай вяртанне з Першай сусветнай. Дадзеная тэма цікавіла папулярных у СССР заходнееўрапейскіх і амерыканскіх творцаў, якія распрацоўвалі розныя аспекты матыву «страчанасці». На ўвазе маюцца Э.М. Рэмарк і Э. Хемінгуэй. Асобныя элементы іх мастацкага досведу (разам са згадкамі пра вайну-кантынуум) пакаладзены ў аснову назіранняў, пададзеных у апавяданні «На Чорных лядах». Персанаж, што атрымаў мянушку Аўстрыяка, ацаніў вынікі свайго гаротнага жыцця наступным чынам: «… Было чаго столькі пакутаваць на вайне ды ў палоне, ісьці ў гэтыя прымакі, ірваць кішкі на запушчанай гаспадарцы, каб апынуцца на зіму жабраком … Ён так імкнуўся дадому, на сваю Беларусь, а тут аказалася горш чым на вайне, у палоне, там хоць быў вораг, там прымушалі рабіць, нават каралі смерцю. Але там кармілі …» [8, с. 175]. Варта адзначыць, што дзейная асоба так і не выйшла з траўматычнага стану змагання за жыццё і чалавечую годнасць, бо зведала ў тым ліку сутнасць бязлітаснай класавай барацьбы, паўстала супраць новых грамадскіх заган, але зноў не змагла знайсці выйсце. Сімптаматычна, што вопыт гэтага персанажа ўспрымаецца як абагульнены досвед цэлага пакалення.

У апавяданні «Чырвоныя пятліцы» В. Быкаў засведчыў, як час і палітычная сітуацыя змянялі адносіны грамадства да Першай сусветнай. Персанаж разважаў пра лёс сваёй сям'і наступным чынам: «… Усё ж час нялёгкі, рознае можа здарыцца. Як здарылася з бацькам, забітым у шаснаццатым на імперыялістычнай вайне. Калі б забілі на грамадзянскай, … стаў бы гонарам для сына, а так чым ганарыцца. Загінуў за інтарэсы капіталістаў і памешчыкаў …» [9, с. 403]. Адчуваецца, што апавядальнік не пагаджаўся са спрошчанай і ўтылітарна скіраванай трактоўкай падзей 1916 г. Яго не столькі дзівілі выказванні персанажа, колькі насцярожвалі змены, якія рыхтавалі не толькі перагляд сямейных каштоўнасцей, але і гісторыі.

М. Тычына адзначаў, што «мастацкая творчасць В. Быкава з часам пачала ўспрымацца і самім аўтарам, і яго крытыкамі як цэласная сістэма, якая мае сваю логіку руху і развіцця» [10, с. 662]. Паводле пісьменніка, аповед пра падзеі XX ст. (у першую чаргу пра Вялікую Айчынную) патрабуе ўзнаўлення ў творы пэўнага грамадска-палітычнага кантэксту, які дазваляе вытлумачыць, напрыклад, жыццёвы шлях персанажаў, матывы іх учынкаў. Працуючы над ваеннай тэмай, мастак слова невыпадкова звярнуўся да узброенага канфлікту-кантынуума. З гэтай нагоды празаік уводзіў у канву аповесцей згадкі пра асноўныя катаклізмы першай паловы XX ст., багатага на лакальныя і сусветныя катаклізмы. Асаблівае месца ў яго спадчыне адыгрывае Першая сусветная – падзея цесна звязаная з гісторыяй уласнай сям'і і свайго народа.

ЛІТАРАТУРА


1. Адамовіч, А. Класік беларускай літаратуры / А. Адамовіч // Збор твораў: у 4 т. / М. Гарэцкі. – Мінск : Маст. літ-ра, 1984. − Т. 1 : Апавяданні 1913–1930. – С. 7–44.
2. Быкаў, В. Доўгая дарога дадому. Кніга ўспамінаў / В. Быкаў // Поўны збор твораў : у 14 т. – Мінск : Саюз беларускіх пісьменнікаў ; М. : ТАА «Выдавецтва "Время"», 2009. – Т. 8 : Мэмуарная проза. – С. 5–425.
3. Быкаў, В. Аблава / В. Быкаў // Поўны збор твораў : у 14 т. – Мінск : Саюз беларускіх пісьменнікаў ; М. : ТАА «Выдавецтва "Время"», 2005. – Т. 2 : Аповесці. – С. 375–453.
4. Гарэцкі, М. Віленскія камунары / М. Гарэцкі // Збор твораў : у 4 т. – Мінск : Маст. літ-ра, 1985. – Т. 3 : На імперыялістычнай вайне. Віленскія камунары. – С. 131–344.




Polotsk SU

5. Шагалов, А. Василь Быков. Повести о войне / А. Шагалов. – М. : Художественная лит-ра, 1989. – 302 с.
6. Быкаў, В. Трэцяя ракета / В. Быкаў // Поўны збор твораў : у 14 т. – Мінск : Саюз беларускіх пісьменнікаў ; М. : ТАА «Выдавецтва “Время”», 2006. – Т. 4. Аповесці. – С. 269–404.
7. Быкаў, В. У ліхую часіну / В. Быкаў // Поўны збор твораў : у 14 т. – Мінск : Саюз беларускіх пісьменнікаў ; М. : ТАА «Выдавецтва “Время”», 2009. – Т. 7. Апавяданні. – С. 271–281.
8. Быкаў, В. На Чорных лядах / В. Быкаў // Поўны збор твораў : у 14 т. – Мінск : Саюз беларускіх пісьменнікаў ; М. : ТАА «Выдавецтва “Время”», 2005. – Т. 1. Аповесьці, апавяданні і прыпавесьці 90-х і 2000-х гадоў. – С. 167–189.
9. Быкаў, В. Чырвоныя пятліцы / В. Быкаў // Поўны збор твораў : у 14 т. – Мінск : Саюз беларускіх пісьменнікаў ; М. : ТАА «Выдавецтва “Время”», 2005. – Т. 1. Аповесьці, апавяданні і прыпавесьці 90-х і 2000-х гадоў. – С. 375–408.
10. Тычына, М. Васіль Быкаў / М. Тычына // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі. Ін-т літаратуры імя Я. Купалы. – 2-е выде. – Мінск : Беларуская навука, 2001. – Т. 3. 1941–1965. – С. 640–688.

## WORLD WAR I PERSEPTION IN V. BYKAU’S WORKS

***Z. TRATSIAK***

*The main V. Bykau’s literary works about the First World War are pointed out. In the writer’s opinion, the past did not lose its importance during a new catastrophe (1931 – 1945). It is not accidental that Bykau’s characters tried to perceive their parents’ experience which gave a chance to understand the Great Patriotic War better. Belarusian prose writer emphasized that in the first half of the 20$^{th}$ century war was a crucial point of human existence. Endless number of military conflicts brought to life the motif of continuous war. It characterized not only V. Bykau’s literary heritage but also the works of some foreign classics (E. Hemingway, for example).*

PolotskSU